**24 лютага — выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.**

**УСЕ НА ВЫБАРЫ!**

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 6 (601) | Субота, 23 лютага 1985 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НАШЫ КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ



**БОКУЦЬ**
**Барыс Васільевіч**

**кандыдат у дэпутаты па выбарах у Гомельскі абласны Савет народных дэпутатаў па Барадзінскай выбарчай акрузе № 75, рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта**

**БОКУЦЬ** Барыс Васільевіч нарадзіўся ў 1926 годзе ў в. Сакалоўшчына Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Беларус. Адукацыя вышэйшая. Член КПСС.

У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у рабоце Уздзенскага партыйнага падполля. Пасля вызвалення Беларусі ваяваў у саставе 2-га Беларускага фронту. З 1947 па 1952 год вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Затым закончыў аспірантуру пры кафедры тэарэтычнай фізікі БДУ. У 1956 годзе абараніў кандыдацкую, а ў 1972 годзе доктарскую дысертацыі, прафесар. Працаваў у Інстытуце фізікі і матэматыкі АН БССР. З 1973 года з'яўляецца рэктарам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

За час работы тав. Бокуць Б. В. зарэкамендаваў сябе прынцыповым, патрабавальным і ўмелым кіраўніком, валодаючым вялікімі арганізатарскімі здольнасцямі. Праводзіць вялікую педагагічную і навуковую работу. Яму належаць фундаментальныя даследаванні ў галіне оптыкі, якія знайшлі шырокае практычнае прымяненне. Ім апублікавана звыш 140 навуковых работ.

Тав. Бокуць Б. В. прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, з'яўляецца членам Гомельскага абкома КП Беларусі, дэпутатам абласнога Савета народных дэпутатаў, членам праўлення абласнога аддзялення Савецкага Фонду міру.

Ратны і працоўны шлях тав. Бокуця Б. В. адзначаны многімі ўрадавымі ўзнагародамі: ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і сямю медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. У 1980 г. тав. Бокуць Б. В. выбраны акадэмікам АН БССР, а ў 1984 годзе за поспехі ў галіне развіцця навукі і тэхнікі яму прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

Тав. Бокуць Б. В. — дастойны кандыдат у дэпутаты Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў.



**ШАМЯТКОЎ**
**Леанід Аляксандравіч**

**кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў па Марозаўскай выбарчай акрузе № 372, прарэктар па вучэбнай рабоце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта**

**ШАМЯТКОЎ** Леанід Аляксандравіч нарадзіўся ў 1937 годзе ў Гомелі. Беларус. Адукацыя вышэйшая. Член КПСС.

Тав. Шамяткоў Л. А. у 1959 годзе закончыў з адзнакай Гомельскі дзяржаўны педінстытут, у 1962 г. — аспірантуру пры Гомельскім аддзяленні Інстытута матэматыкі АН БССР. На пасадзе прарэктара ГДУ па вучэбнай рабоце працуе з 1977 года.

У 1964 годзе абараніў кандыдацкую, а ў 1969 г. — доктарскую дысертацыі. У 1973 годзе яму было прысвоена вучонае званне прафесара. У 1980 годзе абраны членам-карэспандэнтам АН БССР.

Тав. Шамяткоў Л. А. — вучоны шырокага профілю, паспяхова спалучае актыўную навуковую дзейнасць са шматграннай работай па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі. На працягу многіх гадоў ён чытае асноўныя лекцыйныя курсы па спецыялізацыі «Алгебра і тэорыя лічбаў» на матэматычным факультэце. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронена 12 кандыдацкіх дысертацый.

Тав. Шамяткоў Л. А. вядзе вялікую грамадскую работу. Ён з'яўляецца членам Цэнтральнага РК КПБ, дэпутатам і старшынёй пастаяннай камісіі па справах моладзі Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, старшынёй камісіі па прысуджэнню прэмій камсамола Гомельшчыны ў галіне навукі і тэхнікі, членам парткома ГДУ, старшынёй Гомельскага аблсавета педагагічнага таварыства БССР, старшынёй рэспубліканскай секцыі матэматыкі Навукова-тэхнічнага Савета Мінвуза БССР, членам савета па абароне доктарскіх дысертацый пры Інстытуце матэматыкі АН БССР, галоўным рэдактарам міжведамаснага навуковага зборніка «Вопросы математики». За поспехі ў рабоце і актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Тав. Шамяткоў Л. А. — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў.



**АСІПЕНКА**
**Вячаслаў Аляксандравіч**

**кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў па Фядзюнінскай выбарчай акрузе № 368, сакратар камітэта камсамола ГДУ.**

**АСІПЕНКА** Вячаслаў Аляксандравіч нарадзіўся ў 1959 годзе. Рускі. Адукацыя вышэйшая. Член КПСС.

Тав. Асіпенка В. А. закончыў у 1982 годзе эканамічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. За час вучобы праявіў сябе добрасумленным, дысцыплінаваным студэнтам, вучыўся на «добра» і «выдатна». Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта і універсітэта. Выбіраўся сакратаром пярвічнай камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы і камітэта камсамола факультэта.

Тав. Асіпенка В. А. — актыўны ўдзельнік студэнцкага будатрадаўскага руху. Быў камандзірам Жлобінскага і камісарам Гомельскага занальных штабаў СБА, камандзірам Гомельскага гарадскога штаба СБА, камандзірам штаба працоўных спраў ГДУ. За плённую працу па фарміраванню і арганізацыі работы студэнцкіх будатрадаў у 1981 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Узнагароджваўся таксама Ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМБ, абласнога, гарадскога і раённага камітэтаў камсамола, трэстаў і ведамстваў БССР, камітэта камсамола ГДУ.

Пасля заканчэння універсітэта тав. Асіпенка В. А. працаваў на кафедры эканомікі працы. З лістапада 1982 па май 1984 года служыў у радах Савецкай Арміі. У кастрычніку мінулага года выбраны сакратаром камітэта камсамола Гомельскага дзяржуніверсітэта. З'яўляецца членам абласнога і гарадскога камітэтаў камсамола, членам бюро Цэнтральнага РК ЛКСМБ.

Тав. Асіпенка В. А. патрабавальны, прынцыповы таварыш. Ён — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў.



**ПАРАХНЯ**
**Таісія Мікалаеўна**

**кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў па Жаркоўскай выбарчай акрузе № 349, малодшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага сектара.**

**ПАРАХНЯ** Таісія Мікалаеўна нарадзілася ў 1958 годзе ў Гомелі. Беларуска. Адукацыя вышэйшая. Член ВЛКСМ.

Тав. Парахня Т. М. закончыла ў 1975 годзе школу з залатым медалём. Атрымала спецыяльнасць на матэматычным факультэце Гомельскага дзяржуніверсітэта. Паспяховую вучобу спалучала з актыўнай грамадскай дзейнасцю.

Як адна з лепшых выпускніц была пакінута для работы ў навукова-даследчай лабараторыі матэматычнага факультэта. Зарэкамендавала сябе высокакваліфікаваным спецыялістам і чулым таварышам. Да кожнага даручэння адносіцца добрасумленна і з належнай адказнасцю. Вялікую работу праводзіць са студэнтамі.

Тав. Парахня Т. М. выбіралася ў састаў прафбюро факультэта і прафкома універсітэта. Сярод супрацоўнікаў і выкладчыкаў матэматычнага факультэта карыстаецца аўтарытэтам.

Тав. Парахня Т. М. — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў.



**БЫХАЎЦАВА**
**Валянціна Мікалаеўна**

**кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў па Мярэсьеўскай выбарчай акрузе № 367, студэнтка III курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**БЫХАЎЦАВА** Валянціна Мікалаеўна 1962 года нараджэння, беларуска, член ВЛКСМ, адукацыя сярэдняя.

Тав. Быхаўцава В. М. паступіла ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт у 1982 годзе. За час вучобы праявіла сябе здольнай студэнткай, схільнай да вывучэння гуманітарных прадметаў. За выдатную вучобу, актыўную грамадскую работу ўдастоена імянной стыпендыі імя Янкі Купалы.

Тав. Быхаўцава В. М. трэці год добрасумленна выконвае абавязкі старасты групы, выбрана членам камітэта камсамола факультэта, актыўна ўдзельнічае ў патрыятычным студэнцкім будаўнічым руху, займаецца ў навуковым гуртку і мастацкай самадзейнасцю.

Студэнтка патрабавальная да сябе і аднакурснікаў, прынцыпова і па-дзелавому вырашае пытанні, з пачуццём высокай адказнасці выконвае ўсе даручэнні, карыстаецца павагай сярод выкладчыкаў і студэнтаў.

Тав. Быхаўцава В. М. — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета народных дэпутатаў.

